WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
11 СНЕЖНЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 235 (26593)
Кошт 600 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.


Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:
## «ДАГАВОР АБ СТВАРЭННІ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ — ВАЖНАЯ ВЯХА Ў НОВАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІХ АДНОСІНАЎ»

**Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы — важная вяха ў новай гісторыі беларуска-расійскіх адносінаў. Аб гэтым заявіў старшыня Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы ўчора ў Маскве пасяджэнне ВДС.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы з'яўляецца фундаментам стратэгічнага партнёрства дзвюх краін.

«Дзесяцігадовая сумесная работа па выкананні палажэнняў дагавора, актыўная дзейнасць органаў Саюзнай дзяржавы далі магчымасць істотна пашырыць узаемадзеянне ў эканамічнай сферы, захаваць высокі ўзровень прамысловасці і навукова-тэхнічнай кааперацыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Плённа развіваюцца гандлёва-эканамічныя сувязі і рэгіянальнае супрацоўніцтва. Эфектыўна рэалізуюцца саюзныя праграмы».

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь і Расія ў рамках Саюзнай дзяржавы цесна супрацоўнічаюць у сферы ўзмацнення абараназдольнасці і бяспекі, каардынуюць дзеянні на міжнароднай арэне.

Асаблівую ўвагу кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуў на тое, што практычна вырашаны пытанні па забеспячэнні роўных правоў беларусаў у Расіі і расіян у Беларусі. «Пагадзіцеся, што не з кожнай дзяржавай у Беларусі і Расіі ёсць такія ўмовы для грамадзян», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Старшыня Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што неабходна ўважліва прааналізаваць і падрыхтаваць прапановы па адаптацыі фармату і функцый саюзных органаў да работы ва ўмовах Мытнага саюза Беларусі, Расіі, Казахстана і на перспектыву — у Адзінай эканамічнай прасторы.

Аляксандр Лукашэнка выказаўся за неабходнасць даручыць Савету Міністраў Саюзнай дзяржавы да наступнага пасяджэння ВДС выпрацаваць канкрэтныя прыярытэты ў дзейнасці саюзных органаў у эканамічнай сферы з мэтай прадухілення непатрэбнага дубліравання з функцыямі Мытнага саюза.

Ён падкрэсліў, што сістэмная і паслядоўная работа па выкананні палажэнняў саюзнага дагавора садзейнічала фарміраванню Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана. «Наш рух у правільным напрамку ў рамках Саюзнай дзяржавы аказаў стымулюючае ўздзеянне і на нашых партнёраў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён яшчэ раз акцэнтаваў увагу на тым, што прынятыя 27 лістапада ў Мінску на пасяджэнні Міждзяржсавета ЕўрАзЭС рашэнні, у тым ліку якія датычацца стварэння Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана, патрабуюць пераасэнсавання падыходаў да работы органаў Саюзнай дзяржавы. «Гэта датычыцца і нашых адносінаў і паміж міністрамі, і паміж прэм'ер-міністрамі», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Расійскі бок прыняў станоўчыя рашэнні «ў адказ на прапановы беларускага боку па супрацоўніцтве ў нафтавай сферы». Аб гэтым паведаміў Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў у пачатку пасяджэння Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы. «На сённяшні дзень гэта найбольш важнае прынятае рашэнне, якое не створыць праблем беларускаму боку», — сказаў Дзмітрый Мядзведзеў. Пры гэтым ён не ўдакладніў, канкрэтна аб якім рашэнні ідзе размова.

Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў, што праведзеныя перад пачаткам пасяджэння ВДС перагаворы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі «былі вельмі плённыя, як гэта заўсёды бывае ў беларуска-расійскіх адносінах, зацікаўленыя і эмацыянальныя». Дыялог ішоў па ўсім парадку дня, і ў канчатковым выніку бакі выйшлі на скаардынаваныя рашэнні, дадаў Прэзідэнт Расіі. Ён таксама падкрэсліў, што ступень беларуска-расійскай інтэграцыі цяпер не ідзе ні ў якае параўнанне з тым, што было ў беларуска-расійскіх адносінах 10 гадоў таму.

БЕЛТА.



Яблыневы сад на мінскай вуліцы М. Багдановіча пасля нядаўняга снегападу.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## МАРОЗ І СОНЦА
### У НЯДЗЕЛЮ ПРЫ ПРАЯСНЕННЯХ «ПРЫПЯЧЭ» ДА МІНУС 14

**Гэтымі днямі тэрыторыя Беларусі апынецца пад уплывам зоны павышанага ціску. У выхадныя істотна падмарозіць і ўсталюецца сонечнае надвор'е, а невялікі снег чакаецца толькі месцамі, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Першая хваля сапраўды зімовага надвор'я завітае да нас сёння ўдзень, калі пахаладае да мінус 2—8 градусаў, а ў Брэсцкай вобласці захаваецца плюс 1. У суботу і нядзелю стане яшчэ халадней. Так, 12 снежня на працягу сутак будзе трымацца 3—9 марозу, пры праясненнях да мінус 11. Уначы ў нядзелю 4—10 марозу, пры праясненнях да мінус 14, удзень — 1—9 марозу, у паўночным рэгіёне да мінус 11. У пятніцу і суботу на асобных участках дарог галалёдзіца.

У пачатку наступнага тыдня захаваецца ўмерана марознае надвор'е. Чакаецца, што ў панядзелак амаль паўсюдна, а ў аўторак і сераду месцамі па краіне выпадзе добры снег. На дарогах зноў галалёдзіца. Новая хваля арктычнага холаду завітае да нас у сярэдзіне наступнага тыдня, калі тэмпература ўначы знізіцца да мінус 8—14 градусаў, пры праясненнях да 15—18 марозу, удзень мінус 6—13. Сапраўды холадна. Аднак неяк не верыцца, што такая зіма пратрымаецца ў снежні працяглы час.

Сяргей КУРКАЧ.

Рынак працы
## МІНСК ЗМЯНШАЕ ПОПЫТ

**Паводле інфармацыі камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, у пачатку снежня афіцыйны статус беспрацоўнага мелі 4648 жыхароў сталіцы і адначасова ў найбуйнейшым горадзе краіны налічвалася амаль 13 тысяч вакансій. Разам з тым, даводзіцца канстатаваць: сёлета ў сталіцы адзначаецца значнае змяншэнне попыту на працоўную сілу.**

— Скарачэнне заявак традыцыйна назіраецца напрыканцы года — менавіта на гэты час прыпадаюць рэарганізацыі і змяненні штатных раскладаў у шмат якіх арганізацыях, — зазначыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» **намеснік начальніка аддзела арганізацыйна-кадравай работы камітэта Іна СЯМЁНАВА.** — Разам з тым, актыўнасць наймальнікаў сапраўды знізілася — з пачатку года попыт на працоўную сілу ў сталіцы зменшыўся на 29,2 працэнта.

Аднак агульная кан'юнктура рынку працы найбуйнейшага горада краіны засталася амаль без змяненняў — каля 70 працэнтаў заявак наймальнікаў прыпадае на прадстаўнікоў рабочых спецыяльнасцяў. У прыватнасці, **Мінску патрабуецца значная колькасць вадзіцеляў аўтатранспарту, машыністаў, гандляроў, бетоншчыкаў, маляроў, муляраў, тынкоўшчыкаў, мантажнікаў сантэхабсталявання, электраманцёраў, дворнікаў, прыбіральшчыкаў, кухонных рабочых. Апроч таго, застаецца адчувальным дэфіцыт выхавацеляў.**

Між тым, паведаміла Іна Сямёнава, Мінск захоўвае самы нізкі ў краіне ўзровень беспрацоўя — 0,4 працэнта. Пры гэтым апошнім часам у сталіцы пачалі пакрысе скарачацца паказчыкі няпоўнай занятасці. Як сведчыць статыстыка, у кастрычніку ў няпоўным рэжыме працавалі 32,3 тысячы мінчан — на 2,6 тысячы чалавек менш, чым у верасні.

Сяргей ГРЫБ.

## ПАВЫШАНЫЯ МЫТНЫЯ ПОШЛІНЫ НА ЛЕГКАВЫЯ АЎТАМАБІЛІ ЎВОДЗЯЦЦА Ў БЕЛАРУСІ З 1 СТУДЗЕНЯ

**Аб гэтым паведаміў першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Уладзімір ГОШЫН. І ўдакладніў, што павышаючыя пошліны толькі на аўтамабілі,** якія ўвозяцца юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Канчатковае рашэнне адносна ставак пошлін на аўтамабілі для фізічных асобаў яшчэ не прынятае. Цяпер гэта пытанне абмяркоўваецца з расійскімі і казахстанскімі партнёрамі. Вядуцца перамовы і наконт нормаў беспошліннага ўвозу на іншыя тавары.

Нагадаю, што Прэзідэнты Беларусі, Расіі і Казахстана падпісалі Дагавор аб Мытным кодэксе Мытнага саюза 27 лістапада ў Мінску. Паводле слоў **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Вадзіма ПАПОВА,** праект Мытнага кодэкса трох дзяржаў ужо распрацаваны. Цяпер па найбольш адчувальных пазіцыях гэтага дакумента ідуць працэдуры ўзгаднення. Для Беларусі ў гандлі адчувальнымі пазіцыямі з'яўляюцца экспарт прадуктаў харчавання, гатовых прамысловых вырабаў, а таксама імпарт энерганосьбітаў. Пасля ўзгаднення і, калі спатрэбіцца, дапрацоўкі гэты дакумент будзе ўнесены на разгляд Нацыянальнага сходу Беларусі. Мытны кодэкс Мытнага саюза пачне дзейнічаць з 1 ліпеня 2010 года.

— Ужо, наколькі мне вядома, ёсць некалькі прапаноў па ўдасканаленні кодэкса з расійскага боку, ёсць прапановы з казахстанскага, — адзначыў Уладзімір Гошын.

18 снежня, плануецца, кіраўнікі трох дзяржаў сустрэнуцца зноў, каб разгледзець пытанні, звязаныя са стварэннем адзінай эканамічнай прасторы.

Вадзім Папоў адзначыў, што эксперты прагназуюць рост валавога ўнутранага прадукту падчас дзеяння Мытнага саюза. Мяркуецца, што за некалькі гадоў ён вырасце ў кожнай з трох дзяржаў на 15—20 працэнтаў.

— Нялёгка будзе тым прадпрыемствам, якія не займаюцца мадэрнізацыяй, абнаўленнем вытворчасці, маюць высокі ўзровень матэрыяльных, энергетычных выдаткаў, — выказаў сваё меркаванне сенатар. — Ім, безумоўна, давядзецца варушыцца, бо канкурэнцыя ўзрасце. Ад гэтага, у першую чаргу, выйграе пакупнік. Паступленне ж тавараў з трэціх краін будзе рэгламентавацца пагадненнямі і квотамі, якія мы разглядзім таксама. Гэта будзе датычыцца тых груп тавараў, у якіх маюць неабходнасць дзяржавы Мытнага саюза. Мытны саюз — гэта добра, інакш бы Кіргізія і Таджыкістан не выказалі жадання таксама ўступіць у яго.

Што ж датычыцца інстытута спецімпарцёра, то ён будзе дзейнічаць у Беларусі і ва ўмовах Мытнага саюза і падтрымліваць арыентаваныя на экспарт прадпрыемствы.

— Інстытут спецімпарцёраў, — адзначыў Вадзім Папоў, — не парушыць балансу працы на адзінай мытнай тэрыторыі. Цяпер, напрыклад, прапрацоўваецца адзіны заказ на тэхніку. У ім магчымы ўдзел праз тэндары Казахстана і Беларусі. Але гэтыя тэндары трэба ўмець выйграць, прапанаваць, зразумела, канкурэнтаздольную прадукцыю.

Надзея ДРЫЛА.

### Цэны на дарагія іншамаркі павысіліся на 10 %

Пошліны на легкавыя іншамаркі пры ўвядзенні Адзінага мытнага тарыфу вырастуць з 1 студзеня 2010 для юрыдычных асобаў, але ў чаканні росту цэнаў на іншамаркі некаторыя падаўцы ўжываных машын пачалі падымаць цэны на свае аўто ўжо цяпер. Як паведаміў «Звяздзе» **Павел КАРЭВАНАЎ, прадстаўнік папулярнага партала для аб'яў па продажы аўтамабіляў, запчастак і іншай тэхнікі myauto.by,** у апошні час назіраецца некалькі тэндэнцый на рынку аўтамабіляў.

Па-першае, цэны зніжаюцца на аўтамабілі з невялікім коштам — да 5 тыс. долараў. Растлумачыць гэта можна тым, што іх уладальнікі хочуць ад іх пазбавіцца, каб яшчэ да ўвядзення пошлін паспець набыць сабе новую іншамарку.

Па-другое, папаўзлі ўверх цэны на дарагія аўтамабілі, якія былі прыгнаны зусім нядаўна спецыяльна для продажу. Іх кошт за апошнія некалькі месяцаў павялічыўся прыкладна на 10 %. Павелічэнне цаны, як лічыць Павел Карэванаў, справакавана ўзрослым попытам: людзі хочуць набыць новы аўтамабіль менавіта цяпер, бо праз пэўны час набыццё іншамаркі можа наогул стаць немагчымым для сямейнага бюджэту. Ну, а што датычыцца новых аўтамабіляў, то на іх цэны пакуль не змяніліся.

Павел БЕРАСНЕЎ.




### «Зарабіў» больш як паўмільярда

**Даход, які незаконна атрымаў жыхар Маладзечна сёлета за паўгода, склаў 599 мільёнаў рублёў.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, падазроны, у дачыненні да якога Маладзечанскім міжраённым аддзелам упраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Мінскай вобласці і Мінску ўзбуджана крымінальная справа, выкарыстоўваючы рэквізіты, пячаткі, дакументы і разліковы рахунак прыватнага прадпрыемства, рэалізоўваў суб'ектам гаспадарання тавары. Прадпрымальніцкую дзейнасць ён ажыццяўляў незаконна, паколькі не меў пасведчання дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка.

Яшчэ больш «эканоміі» на падатках і зборах, якія ні плаціў ён ні ў бюджэт, незаконна атрымалі жыхары Кобрына. Яны, не маючы намеру ажыццяўляць статутную дзейнасць, стварылі юрыдычную асобу і працавалі з верасня 2006 па ліпень мінулага года. Крыху менш як за два гады падазроныя завінаваціліся дзяржаве істотную суму — 8,9 мільярда рублёў.

Больш «сціплую» суму — 207 мільёнаў рублёў — «зарабіла» віцябчанка, якая гандлявала прадуктамі харчавання і таварамі бытавой хіміі. Як высветлілася, прадпрымальніцтвам жанчына займалася без належнай дзяржрэгістрацыі.

Ігар ГРЫШЫН.

Прамая лінія
### Прыйшла старасць — сышла памяць

Бездапаможныя станы, звязаныя з парушэннем памяці, увагі, разумення, абумоўленыя ў тым ліку сасудзістымі захворваннямі, напрыклад, мікраінсультам у раннім пажылым і старэчым узросце, будуць у цэнтры ўвагі «прамой лініі» з удзелам **загадчыка спецыялізаванага псіхагерыятрычнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Аляксандра Аляксандравіча ГОЛУБА**. «Прамая лінія» адбудзецца **16 снежня, у сераду, з 15.00 да 16.00** па нумарах 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ЧУП «ЛОГОЙСКИЙ КООПТОРГ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже **здания хлебозавода, об. пл. 745,9 кв.м**, расположенного по адресу: Минская область, **г. Логойск, ул. Тимчука, 11.** Начальная цена с НДС – 901 232 800 бел. руб. Площадь земельного участка 0,7110 га. Задаток 50 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.11.2009. Аукцион состоится **18.12.2009** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.12.2009** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

## «ГОЛУБ ЯК СІМВАЛ ДУХА СВЯТОГА»

**Кажуць, што менавіта гэтую птушку чалавек прыручыў першай. Яе мы ведаем яшчэ з Бібліі і карціны Пікаса. Галубы некалькі стагоддзяў выкарыстоўваліся ў якасці самых надзейных паштальёнаў. Іх хуткасць можа дасягаць шасцідзесяці кіламетраў у гадзіну. Праўда, з развіццём сучасных тэхналогій гэтая функцыя «птушкі міру» амаль не выкарыстоўваецца, але цяпер усё большую папулярнасць набірае спартыўная голубагадоўля. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з самым вядомым у беларускіх «птушыных колах» галубаводам Дзмітрыем РУБАШКІНЫМ, здзівіўся коштам на птушак і пачуў слушныя прапановы, як Беларусь можа зарабляць на галубах больш, чым на племянных быках.**

### «ТРЭБА РАЗУМЕЦЬ ПТУШКУ»

*Англійскі біёлаг Гекслі ў свой час пісаў: «Голубагадоўля — вялікае мастацтва, вялікая таямніца, пра якую легкадумна чалавек казаць не можа». Калі Дзмітрый пачаў распавядаць пра свой улюбёны занятак, адразу падумалася — Гекслі ён чытаў..*

— Наогул, кожны чалавек прыходзіць на зямлю з пэўнай мэтай. І асэнсаванне гэтай мэты ва ўсіх праходзіць па-свойму. Мне, напрыклад, спатрэбілася прабыць некаторы час у манастыры, каб пазнаць сябе. Ехаць давялося даволі далёка: больш за 11 тысяч кіламетраў у адзін бок. Але адтуль я вярнуўся іншым чалавекам. Паўстала пытанне, як забяспечваць сваю сям'ю. «Што я ўмею рабіць? Умею займацца галубамі!». Але калі казаў «умею», я, насамрэч, нічога не ўмеў. І гэта пры тым, што вырас каля птушак, бо мой бацька разводзіў галубоў. Тут свая навука, і пакуль не станеш у ёй прафесарам, нічога не атрымаецца. Як кажуць лепшыя галубаводы свету — трэба жыць і разумець птушку, вобраз яе мыслення і гэтак далей.

*Пакуль чалавецтва змагаецца са свіным грыпам і недахопам лекаў, што суправаджае яго, птушкі таксама хварэюць. Але ў іх няма тэрмометраў, даводзіцца спадзявацца толькі на добрага гаспадара.*


Пяцігадовы голуб расы «Беларусь».

— Першых галубоў паехаў купляць у Еўропу ў 2003 годзе. Усё было добра, вывялі каля пяцідзесяці птушанятаў, але ў снежні таго года яны ўсе загінулі. Засталося толькі чатырнаццаць. Высветлілася, што не ўсё так проста. Трапіла нейкая інфекцыя і прынесла з сабой вось такія страты. Ужо пасля таго выпадку мы пачалі вакцынаваць птушак. Асноўная хваробы — хвароба Н'юкасла, сальманелёз і воспа. Выкарыстоўваем беларускую ці расійскую вакцыну, бо браць замежныя варыянты няма сэнсу, хвароба ж мясцовая. Тое самае, як і чалавеку заўсёды лепш выкарыстоўваць у ежу тое, што расце ў радыусе 600 кіламетраў ад месца жыцця.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ДЭПУТАТАМ ЗАРПЛАТУ ПАКІНУЦЬ, ПЕНСІЯНЕРАМ ВЫПЛАТЫ ЗРЭЗАЦЬ

**Дэпутаты Сойма Латвіі прагаласавалі за тое, каб у 2010 годзе пакінуць на ранейшым узроўні свае зарплаты, а таксама кампенсацыі, якія ім належаць.**

Памер дэпутацкай зарплаты будзе складаць, як і раней, 986 латаў (каля 2060 долараў) да выплаты падаткаў. Парламентарыям належаць таксама даплаты за працу ў камісіях, кампенсацыі на жыллё і транспарт і сродкі на прадстаўніцкія выдаткі. Акрамя таго, папраўкі ў рэгламент прадугледжваюць захаванне кампенсацый для тых дэпутатаў, якія не трапяць у наступны склад Сойма. Раней, у сувязі з эканамічным крызісам у Латвіі, дэпутацкія аклады былі зменшаныя, як і зарплаты ў іншых сферах. Аднак у працэнтных адносінах парламентарыі страцілі менш, чым, напрыклад, урачы. Так, зарплата спікера парламента летась знізілася на 12 працэнтаў. А зарплаты ўрачоў, па звестках прафсаюзаў, «схуднелі» за гэты ж час прыкладна на 40 працэнтаў.

А Сойм суседняй Літвы прыняў часовы закон аб пераліку сацыяльных выплат, паводле якога будуць зрэзаныя пенсіі, дапамогі па беспрацоўі і доглядзе дзяцей. У прынятым законе гаворыцца аб паніжэнні пенсій у залежнасці ад іх памеру. Таксама будуць скарочаныя і пенсіі для пенсіянераў, якія працуюць, і інвалідаў II і III груп, прычым інвалідам выплаты зрэжуць на 50 працэнтаў. Памер максімальнай дапамогі па беспрацоўі зменшыцца з 1041 да 650 літаў. Таксама закон прадугледжвае скарачэнне тэрміну выплаты дапамогі на дзіця з трох да двух гадоў.

### РАХМОН БІЎСЯ З КАРЫМАВЫМ

**Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон падзяліўся нечаканымі фактамі з гісторыі сваіх узаемаадносінаў з узбекскім калегам Ісламам Карымавым.**



Таджыкскі лідар зрабіў некалькі цікавых заяў аб тым, як сапсаваліся іх адносіны з прэзідэнтам Узбекістана. Прэзідэнт Таджыкістана расказаў аб сваіх спрэчках з Карымавым, якія, паводле яго слоў, некалькі разоў нават даходзілі да бойкі. Паміж дзвюма краінамі існуе праблема Самарканда і Бухары яшчэ з 1920-х гадоў. Тады пры дзяленні Сярэдняй Азіі бальшавікі аднеслі гэтыя гарады да тэрыторыі Узбекістана. Аднак таджыкі дагэтуль лічаць іх сваім гістарычным і культурным здабыткам.

### БАЕВІКІ НА ФІЛІПІНАХ ЗНОЎ АКТЫВІЗАВАЛІСЯ

**Узброеныя баевікі выкралі больш за 65 грамадзянскіх асобаў на паўднёвым востраве Мінданаа.**



Вядома, што ў ліку выкрадзеных чацвёра працаўнікоў прыватнага лясніцтва, некалькі дзясяткаў вучняў пачатковай школы і адзін настаўнік. Паводле непацверджаных звестак, выкрадальнікі пазней адпусцілі 18 чалавек. Прадстаўнік узброеных сілаў Філіпін расказаў, што матывы выкрадання пакуль няясныя. Ён паведаміў таксама, што ў раён здарэння накіраваныя паліцыя і войска, яны прачэсваюць мясцовасць. Паліцыя мяркуе, што выкраданне можа быць справай рук крымінальнай «банды Перэса», якая складаецца з прадстаўнікоў мясцовых плямёнаў.

### ХТО Ў МАСКВЕ БЯРЭ БОЛЬШ ХАБАРУ

**Маскоўскія сацыёлагі высветлілі, хто ў горадзе часцей за ўсё бярэ хабар.**

Падчас даследаванняў рэспандэнтам прапаноўвалася расказаць, каму яны часцей за ўсё даюць хабар. Пры гэтым на пытанне «ці даводзілася вам на працягу апошніх 12 месяцаў вырашаць праблемы ў паліклініцы, бальніцы пры дапамозе хабару» станоўча адказалі 28,6 % апытаных. Наступнымі фігурантамі апытання сталі супрацоўнікі міліцыі. У дачы хабару інспектарам ДПС і іншым вартавым парадку прызналіся 20,3 % суразмоўцаў. Трэцяе месца па ліку хабарнікаў дасталася дзяржаўным установам: ім грошы ў канверце калі-небудзь прапаноўвалі 14,5 % апытаных. Нясуць масквічы хабар і ў дзіцячыя садкі: кішэні мясцоваму кіраўніцтву папоўнілі 7,4 % рэспандэнтаў. Акрамя таго, 7,1 % удзельнікаў эксперыменту занеслі грошы ў ВНУ. Менш усяго хабарнікаў, згодна з апытаннем, у сталічных судах: іх работнікаў спрабавалі запэўніць у сваёй праваце з дапамогай хабару толькі 1,7 % апытаных, або ўсяго 17 чалавек.

## ЗАХВАРАЛЬНАСЦЬ НА ПРАСТУДУ НА 40 ПРАЦЭНТАЎ НІЖЭЙШАЯ ЗА ЭПІДЭМІЧНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

**Паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.**

У першы снежаньскі тыдзень медыкі назіралі зніжэнне колькасці зваротаў пацыентаў з сімптомамі ВРВІ і грыпу на 17,4 працэнта ў параўнанні з папярэднім тыднем. А ў параўнанні з першым тыднем лістапада, калі ў краіне быў зарэгістраваны рэзкі ўздым захваральнасці на ВРВІ, колькасць захварэлых знізілася на 65,8 працэнта. Усяго з пачатку эпідэмічнага сезона ў кантрольных гарадах Беларусі былі зарэгістраваныя 857 872 выпадкі вострых рэспіраторных вірусных інфекцый. Па стане на 1 снежня супраць сезоннага грыпу былі прышчэплены 1 039 933 чалавекі, што на 39 працэнтаў больш, чым у папярэднім годзе.

Запасы найважнейшых антыбіётыкаў на аптэчных складах і ў арганізацыях аховы здароўя забяспечваюць бягучыя патрэбы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.12.2009 г. (для б/н разлікаў)

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 856,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 201,75 |
| 1 латвійскі лат | 5 937,01 |
| 1 літоўскі літ | 1 216,98 |
| 1 чэшская крона | 163,20 |
| 1 польскі злоты | 1012,71 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 93,25 |
| 1 украінская грыўня | 356,11 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 30,6268 |
| UAH | 38,2357 |
| 1000 BYR | 10,7087 |
| EUR | 45,0735 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.
ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

## Першая Мінская птушкафабрыка

# СПРАВА Ў НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

**Усе магчымыя ўзнагароды самай высокай пробы сабраў калектыў 1-й Мінскай птушкафабрыкі. Пералічым толькі некаторыя з іх: званне лаўрэата прэміі ўрада краіны ў галіне якасці; занясенне на рэспубліканскую Дошку гонару; Залаты сертыфікат якасці; Знак пашаны «Лідар нацыянальнай эканомікі»; Дыплом за перамогу ў рэспубліканскім агледзе-конкурсе «Землекарыстанне высокай культуры земляробства, добраўпарадкаванне машынных двароў, жывёлагадоўчых фермаў і комплексаў» («Дажынкі-2009»); неаднаразовы лаўрэат міжнароднага конкурсу «Выбар года» ў намінацыі «Птушкафабрыка па вытворчасці яек № 1 у Рэспубліцы Беларусь» і многія іншыя. На рахунку калектыву больш за 30 залатых медалёў. Зразумела, усё гэта ў першую чаргу за яго прадукцыю.**



Ну, а гэта прадукцыя — добра вядомая, без яе практычна не абыходзіцца ніводная сям'я. Гэта, вядома ж, курыныя яйкі.

Першая Мінская птушкафабрыка, яўна, не выпадкова мае ў сваёй назве слова «першая». Яна менавіта першая як у вобласці, так і ў краіне па аб'ёмах вытворчасці тых жа яек.

Аднак адразу ж удакладнім: Першая Мінская птушкафабрыка з'яўляецца шматпрофільным сельскагаспадарчым прадпрыемствам. Тут актыўна займаюцца раслінаводствам — вырошчваюць кукурузу, пшаніцу, ячмень, рапс і г.д. Прычым, напрыклад, сёлета многія гаспадаркі знізілі ўраджайнасць збожжавых, а працаўнікі Першай Мінскай птушкафабрыкі мелі нават большую ўраджайнасць, чым летась, у цэлым намалацілі больш за 11 тысяч тон збожжавых. Пры гэтым тут асабліва падкрэсліваюць высокую ўраджайнасць рапсу: больш за 40 цэнтнераў алейнага насення з гектара, у той час як у іншых гаспадарках звычайна атрымліваюць каля 20 цэнтнераў. На Першай Мінскай птушкафабрыцы ёсць немалы малочны статак, які налічвае больш за тысячу галоў, прычым надойваюць за год ад каровы амаль 7 тысяч кілаграмаў малака. А гэта, як вядома, — вельмі добры паказчык.

Але, безумоўна, вытворчасць курыных яек з'яўляецца галоўным кірункам дзейнасці птушкафабрыкі. У агульным аб'ёме валавой сельскагаспадарчай прадукцыі прадукцыя птушкаводства займае 86 працэнтаў. Птушкафабрыка налічвае каля мільёна курэй-нясушак, ад якіх тут штосутачна атрымліваюць па 800—900 тысяч яек. Яны паступаюць як у гандлёвыя пункты Мінска, так і ў гандаль абласных цэнтраў, пры гэтым Першая Мінская птушкафабрыка мае добра развітую сетку ўласнага, фірменнага гандлю.

Некалі быў дэфіцыт яек, а цяпер іх удосталь, айчынная птушкагадоўля набрала добрыя абароты — як у такіх умовах утрымаць свайго пакупніка?

На птушкафабрыцы ўносяць пэўную «іскрынку» ў сваю прадукцыю: наладжваюць выпуск яек, якія ідуць у продаж пад назвай «Знатныя» і «Знатныя-ВІП» — першыя з іх абагачаюцца дэфіцытнымі для нашых тэрыторый селенам і ёдам, другія — селенам, ёдам, вітамінам Е і фоліевай кіслатой (зразумела, гэта абагачэнне зроблена праз адпаведныя кармавыя дабаўкі птушкам), а таксама прапануюць пакупніку «Шчаслівы дзясятак» — адборныя яйкі з прыемным сюрпрызам ва ўпакоўцы. Пакупнік такім чынам атрымлівае прынцыпова новы для яго прадукт, прычым выпуск гэтых відаў яек быў прымеркаваны да абвяшчэння Дзяржаўнай праграмы «Здароўе нацыі». Яшчэ адна свайго роду фішка прадпрыемства — перапяліныя яйкі, выпуск якіх, як зразумела ўжо, таксама наладжаны на птушкафабрыцы і якія, як падкрэсліваюць на ёй, вельмі карысныя для дзяцей. Тут абсталёўваюць спецыяльную ферму, у структурным падраздзяленні «Піянер», на якой утрымліваецца больш за 21 тысячу перапёлак.

* * *

На птушкафабрыцы надзвычай строга захоўваюцца ўсе ветэрынарна-санітарныя прадпісанні (дарэчы, непасрэдна на саму птушкафабрыку нас з фотакарэспандэнтам не пусцілі — як патэнцыяльна небяспечных для птушкі ў эпідэміялагічных адносінах)... Тут маецца спецыяльны санітарны прапускнік; увесь транспарт, што заязджае на птушкафабрыку, апрацоўваецца дэзынфекцыйным растворам, вадзіцелі праходзяць праз дэзынфекцыйную падушку. Дарэчы, наконт адпаведнага санітарнага рэжыму, што захоўваецца на птушкафабрыцы, добра сведчыць наступнае папярэджанне на яе транспартнай прахадной: «Уезд без санітарнага пропуска, дэзынфекцыі, санітарнай апрацоўкі транспарту на тэрыторыю фабрыкі катэгарычна забаронены»... Свае санітарныя прадпісанні існуюць і непасрэдна для тых, хто даглядае птушку. Асаблівая, надзвычайная ўвага — вытворчым памяшканням — птушнікам. Яны пасля так званага выседжвання ў іх птушкі і наступнага вызвалення ад яе, на цэлы месяц спыняюцца на спецыяльную санітарна-дэзынфекцыйную апрацоўку. На птушкафабрыцы падкрэсліваюць: для гэтага рэжыму не страшныя ніякія, нават самыя надзвычайныя інспекцыйныя праверкі. Зрэшты, па вялікім рахунку, гэты надзвычайны рэжым усталяваны не дзеля тых жа інспекцыйных праверак, а дзеля надзейнага захавання гэтага неспакойнага шматлікага птушынага пагалоўя, дзеля яго бяспекі, дзеля бяспекі самой прадукцыі, або тых жа яек, а значыць і бяспекі непасрэдна спажыўца.

Як зазначаюць на прадпрыемстве, іх яйкі можна смела піць «сырымі» (што, дарэчы, больш карысна), без усякай небяспекі падхапіць якую салманелу, толькі перад гэтым трэба добра памыць іх з мылам. Варта тут жа нагадаць: вытворчасць птушкафабрыкі атэставаная на яе адпаведнасць патрабаванням міжнародных стандартаў ISO, а таксама на адпаведнасць патрабаванням міжнароднай сістэмы ХАСП, якая датычыцца бяспекі харчовых прадуктаў для чалавека. Выкананне ўсіх строгіх патрабаванняў санітарнага рэжыму і ўзорна наладжаная арганізацыя вытворчасці, прымяненне на птушкафабрыцы перадавых тэхналогій (усе птушнікі тут не так даўно карэнным чынам рэканструяваныя) дапамагаюць ёй смела выходзіць на значныя экспартныя пастаўкі яек. Напрыклад, у летні час каля 40 працэнтаў іх менавіта экспартуецца — пераважна ў Расію (Калінінградскую вобласць, Маскву, Санкт-Пецярбург), а таксама ў некаторыя іншыя краіны, у прыватнасці ў Казахстан і Малдову. Варта дадаць: падчас той жа рэканструкцыі на птушкафабрыцы ўстаноўлена прагрэсіўнае нямецкае абсталяванне, якое дазволіла без урону для вытворчасці, значна ўшчыльніць птушнікі (павысіць утрыманне ў іх курэй-нясушак з 35 тысяч да 60—66 тысяч), а ў выніку найлепшым чынам аптымізаваць тэхпрацэс, дабіцца значнай эканоміі энергарэсурсаў.

— Мы імкнёмся так працаваць, каб нікому з нас не было сорамна за сваю справу. Такая праца была б немагчымай без тэхнічна высокааснашчанай вытворчасці, кваліфікаваных кадраў, якія заўсёды сумленна робяць гэту справу, без надзейнай падтрымкі «зверху» — з боку міністэрства, мінскіх аблвыканкама і райвыканкама, — падкрэслівае генеральны дырэктар Першай Мінскай птушкафабрыкі Уладзімір Бохан.



У фірменнай краме птушкафабрыкі.
На здымку — запрашае Антаніна Пелеханава.

Уладзімір Уладзіміравіч не так даўно ўзначаліў прадпрыемства. А да гэтага ім доўга кіраваў Генадзь Дзямідчык, які падчас апошніх парламенцкіх выбараў абраны дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны і выконвае ў парламенце абавязкі намесніка старшыні Камісіі па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы.

* * *

Калі мы наведвалі птушкафабрыку, нас настойліва прасілі сказаць колькі слоў пра гэтага чалавека, што мы з задавальненнем і робім. Як адзначалі на фабрыцы, Генадзь Дзямідчык у свой час зрабіў значны ўнёсак у яе станаўленне і развіццё. 20 гадоў адпрацаваў Генадзь Іосіфавіч тут менавіта на пасадзе генеральнага дырэктара, а пачынаў некалі з пасады заатэхніка. Кіраўніком жа яго выбралі на сходзе калектыву (на той час кіраўнікоў менавіта выбіралі), што, дарэчы, добра сведчыла аб яго высокім аўтарытэце. Як расказалі на фабрыцы, працоўны дзень Генадзя Іосіфавіча пачынаўся ў шэсць гадзін раніцы з аб'езду ўсіх аб'ектаў прадпрыемства. І ўжо да афіцыйнага пачатку працоўнага дня ў яго была дакладная, свежая інфармацыя аб стане спраў ва ўсіх вытворчых падраздзяленнях. Заканчваўся ж яго працоўны дзень позна вечарам. Прывучыў ён да напружанага рытму працы і сваіх спецыялістаў. Каля года таму пакінуў Генадзь Іосіфавіч сваё кіраўніцкае крэсла на птушкафабрыцы (праўда, як зазначаюць тут, тым не менш, нярэдка наведвае яе і цяпер), але справа яго, можна смела меркаваць, у надзейных руках.

* * *

Калектыў Першай Мінскай птушкафабрыкі захоўвае набраны ім добры тэмп, фабрыка працягвае развівацца далей. У наступным годзе да яе намечана далучыць птушкафабрыку імя Крупскай. Адпаведна, трэба будзе падстроіць гэтае новае падраздзяленне да агульнага рытму, расп аўсюдзіць на яго тыя ж добра асвоеныя перадавыя тэхналогіі. Усё гэта прынясе яшчэ больш высокія вынікі. У прыватнасці, штодзённы збор курыных яек на рэарганізаванай Першай Мінскай павінен перавысіць мільён штук. На фабрыцы збіраюцца значна пашырыць уласную кармавую базу з тым разлікам, каб яна забяспечвала палову адпаведных кармавых патрэбнасцяў. У калектыву і іншыя добрыя планы, якія ён мяркуе абавязкова ажыццявіць.

* * *

А на заканчэнне — наступная, з дазволу, дэталь. У птушкафабрыкі ёсць невялікі гандлёвы павільён на вуліцы Кальцова ў Мінску з даволі разнастайным харчовым асартыментам. Чарга каля гэтага павільёна — пастаянная, прычым стаяць у гэтай чарзе, як правіла, пажылыя людзі, непрацуючыя пенсіянеры. Што прыцягвае сюды пакупнікоў? Асартымент? Што ў асартыменце? Ну вядома ж, у першую чаргу яйкі, прычым як белыя, так і каляровыя, а яшчэ курыныя супавыя наборы, розныя мясныя паўфабрыкаты, каўбасныя вырабы — рулеты, сасіскі, вяндліна, а таксама малако, смятана, сыры «Сулгуні», «Брынза», «Алёнка» і г.д. Словам, вельмі багаты асартымент, у ім можна знайсці амаль усё, што патрэбна для нармальнага харчавання чалавеку. Але не адзін асартымент прыцягвае сюды пакупнікоў, прычым, як ужо зразумела — пакупнікоў з адносна невялікімі даходамі. «Гэта менавіта наша крама, — падкрэсліваюць яны. — Менавіта яе прадукты якраз па нашай кішэні. Дзякуй працаўнікам птушкафабрыкі».

**Іван БАРАНОЎСКІ.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**
*УНП 600068728.*



На машынным двары прадпрыемства.

# КЛЁВАЕ МЕСЦА



Менавіта такім лічаць рыбаловы-аматары возера Кромань, чый блакіт распасцёрся сярод ціхіх засеняў Налібоцкай пушчы. Сапраўды, тут, калі пашчасціць, з азёрных глыбіняў, якія месцамі дасягаюць больш як 20 метраў, можна вылавіць важкіх і трапяткіх карпаў, ляшчоў, сазанаў. Можа ўхопяць прынаду і драпежнікі — шчупак ды сом.

Нядаўна арандатары воднай плошчы НВТК «Аналіз-Х», каб прыбавіць рыбалоўнага шанцу, падрыбілі блакітныя недры, запусціўшы ў возера паўтары тоны шчупачкоў і паўтоны самоў, ды не малькоў, а кілаграмовых рыбін. Старшыня азёрнага комплексу Яўген Рахманько ўпэўнены ў поспеху прыродаабагачальнай працы.

**Васіль ЗЯНЬКО. Фота аўтара.**





## У НАВАГОДНЮЮ НОЧ ПРАБЛЕМ З МІЖГАРОДНЯЙ СУВЯЗЗЮ НЕ БУДЗЕ...

...Праўда, для гэтага тэлефонным абанентам давядзецца праявіць цярплівасць. РУП «Белтэлекам» папярэджвае, што з 12 па 20 снежня будзе праводзіцца мадэрнізацыя міжгародняй станцыі, у тым ліку станцыі лічбавай сеткі з нумарацыяй у Мінску 210 хх хх, 211 хх хх і 217 хх хх. Падчас правядзення работ не выключаны праблемы з доступам да некаторых паслуг тэлефоннай сувязі ці часовае пагаршэнне іх якасці. У прыватнасці, могуць узнікнуць цяжкасці з выхадам абанентаў на мінскую гарадскую тэлефонную сетку, міжгароднюю і міжнародную тэлефонную сетку, а таксама праблемы з камутаваным доступам у інтэрнэт. Каб знізіць верагоднасць магчымых нязручнасцяў, усе работы будуць праводзіцца ў начны час.

Як патлумачылі ў прэс-службе РУП «Белтэлекам», падчас мадэрнізацыі адбудзецца замена абсталявання і абнаўленне праграмнага забеспячэння міжгародняй станцыі. Абсталяванне новага пакалення дазволіць значна павялічыць колькасць міжгародніх выклікаў, якія апрацоўваюцца, асабліва падчас найбольшай нагрузкі ў святочныя дні. А ў мабільных апаратараў з'явяцца новыя магчымасці ў плане паслуг міжнароднага роўмінгу, уліку тэлефоннага трафіку і іншыя. У той жа час пашырэнне канальнай ёмістасці міжнароднай станцыі дасць магчымасць павялічыць колькасць каналаў па наяўных напрамках і забяспечыць уключэнне новых.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## БРАКАНЬЕРЫЎ З САМАРОБКАЙ

У паляўнічых угоддзях Гарадоцкай паляўнічай гаспадаркі вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Ваенпаляванне» работнікі Віцебскай аблінспекцыі затрымалі грамадзяніна, які незаконна паляваў тут з наразной самаробнай зброяй калібру 5,45 міліметра. Прычым на ёй быў усталяваны паляўнічы прыцэл замежнай вытворчасці. Акрамя зброі ў парушальніка канфіскаваны 21 патрон таго ж калібру.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДОГЛЯД ДЗІЦЯЦІ — БАЦЬКУ ЦІ МАЦІ

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ



Алена ДЗЕВОЙНА
(8 017) 287 19 68

**Мы з мужам працуем у адной арганізацыі. Нашаму сыну адзін год, я цяпер знаходжуся ў водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў. Пакуль сыну не споўнілася тры гады, я хацела б выйсці на працу ў другую арганізацыю, а ў водпуск па доглядзе, я чула, можа пайсці бацька. Ці патрэбна папярэджваць пра гэта наймальніка бацькі і за які тэрмін? Калі так, то якія дакументы для пераафармлення водпуску на яго трэба падаць? Дайце спасылку на нарматыўныя акты.**

**Вольга,** *г. Мінск*

Артыкулам 185 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь вызначана, што асобы, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў, па іх жаданні могуць у перыяд гэтага водпуску працаваць на ўмовах няпоўнага працоўнага часу (не больш за палову месячнай нормы гадзін) і дома з захаваннем штомесячнай дзяржаўнай дапамогі.

Калі занятасць складае больш за палову месячнай нормы гадзін, дапамога выплачваецца ў памеры 50 працэнтаў (артыкул 13 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей»).

У прыведзеных вытрымках гаворыцца аб праве працаваць менавіта ў перыяд водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў.

Вы ж пішаце, што для гэтага хацелі б перааформіць водпуск на бацьку. Аднак не ўлічылі, што пры гэтым ваш водпуск будзе спынены, бо не могуць адначасова і бацька і маці быць у водпуску па доглядзе аднаго дзіцяці.

Такім чынам, пры пераафармленні водпуску на бацьку вы павінны будзеце прыступіць да працы па сваім цяперашнім месцы, з якога пайшлі ў водпуск. Калі ж вельмі хочаце працаваць у другой арганізацыі, пераход туды магчымы праз звальненне.

Папярэджваць наймальніка пра тое, што бацька хоча пайсці ў водпуск па доглядзе дзіцяці, неабходна. За які тэрмін, гэта вырашаць вам. Аднак трэба мець на ўвазе, што ісці ў гэты водпуск бацька можа толькі пасля выдання наймальнікам загада аб прадастаўленні яму такога водпуску.

Наймальнік абавязаны даць бацьку такі водпуск на падставе часткі 3 артыкула 185 і артыкула 271 Працоўнага кодэкса, якімі прадугледжана, што гэты водпуск даецца па меркаванні сям'і бацьку, які працуе, іншым сваякам, якія фактычна ажыццяўляюць догляд дзіцяці.

Для пераафармлення водпуску на бацьку або іншага члена сям'і на яго месца працы падаецца даведка з месца працы маці аб выхадзе яе на працу да заканчэння водпуску па доглядзе дзіцяці ўзростам да трох гадоў.

Гэта прадугледжана падпунктам 26.7 пункта 26 Палажэння аб парадку назначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31.03.2008 г. № 490.

Паколькі ж вы працуеце ў адной арганізацыі, мяркую, такая даведка не спатрэбіцца. На падставе вашай і вашага мужа заяў будуць належным чынам аформлены ваш выхад на працу і водпуск па доглядзе дзіцяці вашаму мужу.

Минский городской центр недвижимости

КУП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
28 декабря 2009 г.

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже обращенного в доход государства изолированного помещения (двухкомнатной квартиры), расположенной по адресу: г. Минск, ул. Сердича, д. 66, кв. 60 (четвертый этаж пятиэтажного дома, общая площадь – 48 кв.м, жилая площадь – 30,5 кв.м). Инвентарный номер – 500/D-241015.**

Начальная цена снижена на 10 % и составляет 135 051 840 рублей.

**К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:** заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 13 000 000 рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **28 декабря 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляется с 10 по 28 декабря 2009 года до 18.00 (в пятницу до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефон для справок: (017) 227 40 22, www.mgcn.by.**

# «Песня года-2009» абеларусілася

Прарыў

## Упершыню адразу некалькі артыстаў выканалі на цырымоніі беларускамоўныя песні

Падвядзенне музычных вынікаў года сёлета атрымалася як ніколі адметным. Па-першае, вясёлым натоўпам выканаўцаў, адміністратараў, прадзюсараў і падтанцоўкі за кулісамі: практычна ўсе шчаслiўцы, абраныя для здымак, сабраліся загадзя — відаць, засумавалі нашы артысты па такіх тусоўках. Не даехала на запіс толькі Аня Шаркунова, дый тое па важкай прычыне — з-за надвор'я затрымалася ў аэрапорце Ашхабада. Па-другое — і гэта па-добраму здзівіла — была практычна поўнай і вялікая зала Палаца Рэспублікі, нягледзячы на тое, што суайчыннікі, каго ні спытай, дружна выказваюць «фе» ў адрас айчынных зорак. Можа, хітруюць? Або таксама засумавалі без штогадовых артыстычных парад-але?

Прынамсі, на гэты раз сапраўды было на што паглядзець і што паслухаць. Недасведчаным давялося па ходзе дзеяння рашаць задачку «знайдзі і запомні дзесяць адрозненняў паміж дзяўчатамі з гуртоў «Новыя Верасы» і «Лас-Вегас». Дасведчаную ж публіку чакаў сюрпрыз: хіба гурт «Atlantica» спявае на беларускай мове?! Аказалася, яшчэ як спявае, і не толькі «Atlantica»! Упершыню адразу некалькі артыстаў прадэманстравалі ў «Песні года Беларусі» кампазіцыі на беларускай мове. Звязана гэта, як высветлілася, найперш з тым, што раней дыпламантаў «Песні» выбіралі радыёстанцыі па частаце ратацый (а наколькі актыўна ў нас рацірующца беларускамоўныя песні, ведае кожны, хто хоць раз уключаў любую FM-станцыю на выбар), а сёлета спіс кандыдатаў зацвярджаў тэлеканал АНТ, які паклапаціўся, каб у праграме не было ні англа-, ні рускамоўнага засілля. Таму і парадавалі публіку родным мілагучным словам Галіна Шышкова, Ваня Буслай са свежай песняй «Я захлынаюся» і «Atlantica» з наўмысна перакладзенай «Ты не адзін такі» (у арыгінале — «It's Not About Us»). Апошнія налета ўвогуле плануюць запісаць зборнік беларускамоўных песень, магчыма, у супрацоўніцтве з тым жа паэтам Віталем Воранавым, які пераклаў узгаданы хіт.



Іван БУСЛАЙ больш радаваўся не атрыманаму дыплому, а здзіўленаму прызнанню некаторых калег: «Слухай – выдатная песня».

### Спяваюць усе!

Той факт, што вядомы псіхатэрапеўт доктар Дзмітрый Сайкоў кадзіруе не толькі медыцынскімі сродкамі, але і песнямі ў стылі гарадскога раманса, ужо неяк уклаўся ў масавай свядомасці. А вось таго, што пасярод цырымоніі раптам заспяваў (прычым добра пастаўленым голасам, і ніводнага разу не заікнуўшыся) вядучы АНТ Яўген Смарыгін, выклікала сапраўдны шок — прычым як у публіцы, так і ў рэжысёраў канцэрта, якія даведаліся пра гэта літаральна за пару хвілін да пачатку «Песні года». Калі б Жэня за гэты час не знайшоў чысты CD-дыск, каб перагнаць фанаграму, сюрпрызу магло б і не атрымацца.

«Як хоць называецца гэты твор? — ліхаманкава запісвалі адміністратары незапланаванае дапаўненне ў праграме. — «Маленькі сабачка», словы мае і каманды КВЗ «ЧП», музыка мая і аднаго ўкраінскага аўтара — зрэшты, напішыце, што таксама мая», — задаволены эфектам, распараджаўся Смарыгін. — Дакладна «Маленькі сабачка»? Нам толькі што сказалі «Маленькі камарык»! — разгубіліся дзяўчаты. — А там і пра сабачку, і пра камарыка», — абаяльна ўсміхнуўся вядучы. Між іншым, з гэтай песняй Жэня сарваў такія апладысменты, што некаторыя прафесійныя артысты зайздросна пераглядваліся за кулісамі: яшчэ адзін канкурэнт! А мы ўзгадалі, як летам Жэня пад сцэнічным імем Яўген Міхайлавіч удзельнічаў у Кіеве ў адборы на музычны конкурс «Новая хваля». Глядзіш, налета менавіта яго мы там і ўбачым?

### Крызіс не пройдзе?

Частка артыстаў ужо відавочна настройвалася на святочны лад — Іна Афанасьева, рэпетуючы сустрэчу Года тыгра, красавала ў леапардавай сукенцы. Іншыя, наадварот, абмяркоўвалі справы працоўныя, у тым ліку і переднавагоднія карпаратывы. Скарыстаўшы выпадак, мы пацікавіліся ў беларускіх «зорак» — ці адчулі яны на гэтых заказах злавесны подых крызісу, якім цэлы год мы палохалі адно аднаго?

— Працы стала больш, але грошай стала менш, вось у чым асаблівасць, — адзначыла спявачка Ларыса Грыбалёва, па сумяшчальніцтве ўладальніца святочнага агенцтва. — Таму нам давялося крыху перакваліфікавацца на дробныя заказы. Новы год людзі ўсё адно святкуюць, проста робяць гэта не ў тых маштабах, як раней — пачалі лічыць грошы і не выкідваць іх на вецер. Я, напрыклад, нават рада таму, што людзі звернуць больш увагі не на вонкавыя рэчы, а на сваю сям'ю, блізкіх і родных людзей. А крызіс? Крызіс насамрэч яшчэ не пачаўся!

— Мы таксама будзем працаваць у навагоднюю ноч, — далучыўся вакаліст «Atlantica» Алекс Дэвід. — Разглядаем некалькі прапаноў — не магу сказаць, што іх стала менш, можа, толькі заказчыкі сталі больш патрабавальнымі, але гэта нармальная з'ява, як у любым бізнэсе, торг да месца *(смяецца)*.

Удзельнікі гурта «Litesound» расказалі, што летась больш адчувалася памкненне людзей зэканоміць, а ў гэту навагоднюю ноч, наадварот, заказаў як ніколі шмат. Нават спявачка Вікторыя Алешка, якая раней прынцыпова сустракала свята ў коле родных і сяброў, падумвае над тым, каб перагледзець прынцыпы і выступіць на некалькіх вечарынках.



Перад выступленнем Галіна ШЫШКОВА найбольш хвалявалася, каб хтосьці не наступіў на «хвост» яе доўгай шыкоўнай сукенкі.

...Кур'ёзаў за кулісамі не адбылося — нават словы сваіх кампазіцый ніхто не забыў. А вось фінальную беларускамоўную навагоднюю песню, якую выконвалі ўсе ўдзельнікі разам, артыстам давялося развучваць на хаду. На тое, каб запомніць без паперкі два куплеты, зоркам спатрэбілася 15 хвілін і імправізаваная рэпетыцыя. Якім атрымаўся вынік, цікаўныя змогуць убачыць на АНТ 31 снежня.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота Сяргея ЧОРНАГА.**

# Краіна здароўя

Выпуск № 51 (165)

## «Здароў, скрыпучы, мяккі снег!»



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

Дзіцячы прыём

# Вірусам «хваробы пацалункаў» інфіцыраваны амаль усе людзі

**АЛЕ не ў кожнага ўзнікаюць яе клінічныя праявы. Аб загадкавай прыродзе такога захворвання, як монануклёз, нам расказаў <u>кандыдат медыцынскіх навук дацэнт кафедры дзіцячых інфекцыйных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта Аляксандр КУДЗІН</u>.**

— Монануклёз — гэта захворванне, якое не адносіцца да разраду вельмі папулярных інфекцый. Але тым не менш ён дастаткова распаўсюджаны і можа выклікацца рознымі ўзбуджальнікамі, часцей за ўсё — вірусам Эпштэйна-Барр. Адбываецца гэта часцей за ўсё ў першыя пяць гадоў жыцця чалавека. Аднак у такім узросце, як правіла, інфекцыя праходзіць бессімптомна. А вось клінічныя праявы часцей за ўсё бываюць у падлеткаў і асобаў маладога ўзросту.

***— Чаму ў адных людзей гэта інфекцыя праяўляецца, а іншыя могуць насіць вірус у арганізме, нават не падазраючы аб гэтым?***

— Магчыма, такое звязана з асаблівасцямі ўзаемадзеяння віруса і імуннай сістэмы чалавека. Гэта той выпадак, калі клінічныя праявы залежаць ад індывідуальнай рэакцыі на канкрэтны ўзбуджальнік.

***— Як жа перадаецца інфекцыйны монануклёз?***

— Заражэнне магчымае толькі пры вельмі цесным кантакце хворага са здаровым, адбываецца паветрана-кропельным шляхам. Некаторыя спецыялісты называюць монануклёз «хваробай пацалункаў». Па-першае, ён утрымліваецца ў сліне, а па-другое, ён не лётае, і далёка ад сябе распаўсюдзіць гэты вірус нельга. І невыпадкова тое, што 70 % дзяцей атрымліваюць вірус у першыя гады жыцця. Яго малым перадаюць бацькі, бабулі, якія вельмі любяць цалаваць сваіх гарэзаў.

***— Якая сімптаматыка хваробы?***

— Пры класічнай карціне монануклёзу ўзнімаецца тэмпература да 38-39 градусаў, у некаторых выпадках яна можа быць і вышэйшай. З'яўляецца слабасць, млявасць, ацёчнасць задняй сценкі глоткі, яе гіперымія. Пашкоджваецца насаглотачная міндаліна (адэноіды), у сувязі з гэтым адзначаецца закладзенасць носа, ускладненне насавога дыхання і «храпячае» дыханне з паўадкрытым ротам. Нягледзячы на выражаную закладзенасць носа, выдзяленняў з яго звычайна не бывае.

Ва ўсіх хворых дзяцей назіраецца гепата-ліенальны сіндром (пашкоджанне печані і селязёнкі). Пры прыёме пэўных лекаў можа з'явіцца высыпка.

Важны сімптом інфекцыйнага монануклёзу — павелічэнне ўсіх груп лімфатычных вузлоў, пераважна шыйных. Нярэдка павелічэнне лімфатычных вузлоў бывае першым сімптомам хваробы. І гэта павінна насцярожыць урача, каб правільна паставіць дыягназ і прызначыць лячэнне.

Але па такой класічнай схеме монануклёз праходзіць не заўсёды. Тыя ці іншыя сімптомы могуць адсутнічаць. У гэтым выпадку для пастаноўкі дыягназу робіцца агульны аналіз крыві.

***— Наколькі магчымыя ўскладненні пасля перанесенага монануклёзу?***

— Як і пры любой інфекцыі, наступствы могуць быць. Але з самім вірусам яны звязаныя вельмі рэдка, аднак таксама сустракаюцца ў выглядзе энцыфалітаў, кардытаў. Сярод цяжкіх ускладненняў, аб якіх спецыялісты гавораць часцей за ўсё, — гэта разрывы селязёнкі. Бо падчас інфекцыі яна павялічваецца, становіцца шчыльнай, траўмуецца. Таму дзецям, якія перанеслі монануклёз, не рэкамендуецца займацца фізкультурай два месяцы і паўгода — фізічна-актыўным спортам.

***— У чым заключаецца лячэнне монануклёзу?***

— Спецыфічнай тэрапіі няма. Таму ў практыцы выкарыстоўваюць сімптаматычную. У перыяд ліхаманкі — гарачкапаніжальныя сродкі і багатае піццё. Рэкамендуецца паласканне горла пасля яды цёплымі растворамі. Паказаны таксама пасцельны рэжым.

У цэлым жа імунная сістэма, якая сфарміравалася ў дачыненні да гэтага віруса, павінна справіцца сама і дадаткова ўздзейнічаць на ўзбуджальнік не трэба. Таму асноўная мера прафілактыкі монануклёзу ў тым, каб падтрымліваць сваю імунную сістэму ў нармальным стане. А менавіта: загартоўвацца, паўнавартасна харчавацца, весці здаровы лад жыцця, займацца спортам і імкнуцца не хварэць на іншыя хваробы.

**Гутарыла Вольга ШАЎКО.**

Інфарм-укол

## ЛІШНЯЯ ВАГА І АНКАЛОГІЯ

**Аналіз анкалагічных захворванняў паказвае, што лішняя вага і атлусценне служаць прычынай:**

— не менш як 20 працэнтаў усіх смерцяў ад раку;

— павышэння рызыкі развіцця як мінімум 9 відаў раку — кішэчніка, малочнай залозы, маткі, ныркі, стрававода, падстраўнікавай залозы, жоўцевага пузыра, печані і страўніка;

— абцяжарвання ранняй дыягностыкі пухлін;

— перашкоды ў вызначэнні вяртання злаякаснай пухліны;

— абцяжарвання падбору эфектыўнай дозы хіміятэрапеўтычных прэпаратаў і дозы прамянёвага ўздзеяння;

— у 2 разы большай рызыкі развіцця раку цела маткі пры лішняй вазе і ў 5 разоў — пры атлусценні;

— у 3 разы большай рызыкі развіцця раку ныркі і стрававода і ў 2 разы — тоўстай кішкі.

## ЛІШНЯЯ ВАГА І ІНШЫЯ ХВАРОБЫ

**Вучонымі вызначана сувязь атлусцення з такімі захворваннямі, як...**

1. Гіпертанічная хвароба. У асобаў сярэдняга ўзросту з лішняй вагой верагоднасць развіцця артэрыяльнай гіпертэнзіі на 50 працэнтаў вышэйшая, чым сярод тых, хто не пакутуе ад такой праблемы. Павелічэнне вагі суправаджаецца ростам сісталічнага і дыясталічнага ціску, а кожныя лішнія 4,5 кг павялічваюць сісталічны ціск на 4,4 мм рт. слупка ў мужчын і на 4,2 — у жанчын.

2. Парушэнне вугляводнага абмену. Зніжэнне адчувальнасці клетак да інсуліну — асноўны механізм развіцця цукровага дыябету 2-га тыпу. Паводле звестак амерыканскіх вучоных, у больш за палову людзей, якія пакутуюць ад лішняй вагі, ёсць розныя парушэнні вугляводнага абмену.

3. Парушэнне ліпіднага абмену. Змяненні ліпіднага спектра крыві і больш хуткае і інтэнсіўнае развіццё атэрасклератычнага пашкоджання сасудаў, у першую чаргу сэрца, мозгу, нырак, спрыяе развіццю інфарктаў і інсультаў.

4. Развіццё пухлін. Атлусценне павышае рызыку развіцця не толькі пухлін, але і надыход смерці ад раку: ад раку маткі — у 6 разоў, ныркі — у 5, шыйкі маткі — у 3, малочнай залозы, жоўцевага пузыра, падстраўнікавай залозы і стрававода — у 2 разы.

5. Павышэнне рызыкі развіцця паталогіі пазваночніка і суставаў у больш маладым узросце.

## У КУРЦОЎ — СКАРОЧАНЫ СЦЭНАРЫЙ

**На сёння існуе больш за 60 тысяч навуковых даследаванняў, якія пацвярджаюць шкоднае ўздзеянне тытуню на здароўе чалавека. Зарэгістраваны 24 небяспечныя для жыцця захворванні — наступствы курэння. Жыццё курыльшчыка карацейшае у сярэднім на 7,5 года. Кожны другі курэц рызыкуе памерці ў актыўным узросце.**

Тытунёвы дым утрымлівае звыш 4700 рэчываў, 43 з якіх — канцэрагенныя, здольныя выклікаць рак. Сярод людзей ва ўзросце да 40 гадоў рызыка ўзнікнення інфаркту ў курцоў у 5 разоў большая, чым у тых, хто не курыць. Вокіс вугляроду або чадны газ перашкаджае насычэнню крыві кіслародам. У альвеолах — самых дробных лёгачных пузырках, дзе ажыццяўляецца газаабмен, адбываюцца незваротныя змяненні. Расце рызыка ўзнікнення спазма сасудаў, трамбозу, парушэння кровазвароту, абмену рэчываў, з-за чаго ўзрастае і рызыка развіцця дыябету. У курцоў у дзясяткі разоў узрастае верагоднасць захварэць з цягам часу на рак носа, языка, поласці рота, слінных залоз і глоткі, горла, стрававода, гартані, страўніка, нырак, мачавога пузыра, палавых органаў, падстраўнікавай залозы, тоўстай і прамой кішкі, а таксама цела маткі. Рак падобных лакалізацый можа ўзнікнуць і ў пасіўных курцоў. Жонкі курцоў жывуць у сярэднім на 5 гадоў менш, чым жонкі некурцоў.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ГАЛОЎНЫ РЫНАК ПЯРОЙДЗЕ НА «ЎЗМОЦНЕНЫ» РЭЖЫМ

**Сталічная Камароўка з 22 па 31 снежня будзе працаваць без выхадных, паведамілі «Звяздзе» ў адміністрацыі рынку.**

Адменены нават санітарны дзень у панядзелак, калі галоўная «харчовая крама» не працавала. У пазначаны тэрмін санітарныя мерапрыемствы будуць праводзіцца ўвечары пасля заканчэння гандлю. Працаваць з 22 па 31 снежня Камароўскі рынак сталіцы будзе з 9 да 19 гадзін. Як папярэдне мяркуецца, выхаднымі для гандлю днямі стануць 1 і 4 студзеня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПРАВЕР СВАЕ РАДЗІМКІ

**ПАЛІЧЫЦЬ, запомніць і рэгулярна правяраць. Медыкі настойліва заклікаюць правесці «інвентарызацыю» радзімак.**

Любая пігментная плямка патэнцыяльна небяспечная, асабліва, калі з'явілася яна пасля 30 гадоў. У радзімках у вялікай колькасці ўтрымліваюцца меланацыты — клеткі, якія ўдзельнічаюць у афарбоўцы скуры. Пад уздзеяннем пэўных фактараў яны могуць перараджацца і даваць пачатак самаму агрэсіўнаму віду раку скуры — меланоме. Пры раннім дыягнаставанні хвароба вылечная, пры выяўленні на позніх стадыях шанцы на шчаслівы канец значна змяншаюцца. Меланома вельмі хутка дае метастазы і захоплівае іншыя органы праз крывяносныя сасуды і лімфатычныя вузлы. А тое, што ў радзімцы ўжо пачаўся небяспечны працэс, чалавек і не бачыць. Ён нават і не ведае, што 2—3 разы на год іх рэкамендуецца аглядаць, сачыць за з'яўленнем новых, а пры любым сумненні звяртацца па кансультацыю як мінімум да дэрматолага, а лепш да дэрматаанколага, узброенага сучаснымі сродкамі ранняй дыягностыкі.

Радзімка (невус) — гэта пігментнае новаўтварэнне карычневага або цёмна-карычневага колеру, якое ўтрымлівае ў сваёй аснове клеткі-меланацыты і меланін. У адрозненне ад радзімых знакаў, невусаў пры нараджэнні на целе няма, яны ўзнікаюць на працягу жыцця (цікава, што іх колькасць напрамую залежыць ад таго, колькі чалавек загарае). У кожнай радзімкі свой жыццёвы цыкл. Як правіла, яна з'яўляецца як невялікая плоская плямка, а потым можа крыху ўзвышацца над скурай. Усё залежыць ад таго, на якім узроўні скуры размешчаныя пігментныя клеткі-меланацыты. Калі яны знаходзяцца ў верхнім слоі (эпідэрмісе), радзімка плоская. Калі паглыбляюцца ў дэрму, радзімка пачынае ледзь-ледзь узвышацца над узроўнем скуры. Гэта «ўзвышэнне» не мае ніякіх негатыўных наступстваў. Галоўнае, каб радзімка была аднаго колеру, невялікага памеру і круглаватай формы на працягу ўсяго жыцця.

Каб справакаваць радзімку да перараджэння, безумоўна, неабходны штуршок, раздражняльнік. Самы моцны з усіх магчымых — **сонца**. Ультрафіялетавае апрамяненне ў вялікіх дозах выклікае неабарачальныя змяненні ў клетках скуры, у шмат разоў павялічваючы рызыку іх перараджэння. Для кожнага чалавека крытычная колькасць інсаляцыі вельмі індывідуальная. Вызначыць гэту мяжу нялёгка, таму лепш проста запомніць, што працяглае знаходжанне на сонцы ідзе на шкоду арганізму. Скура вымушана абараняцца ад ультрафіялетавага выпраменьвання. Празмерны загар — гэта немінучыя апёкі, якія «б'юць» па імунітэту скуры. А яна, маючы незвычайную, уласцівую толькі ёй «памяць», не даруе непасільных сонечных удараў. Як вынік — з'яўленне ўсялякіх злаякасных новаўтварэнняў. (Найбольш схільныя да мутагеннага ўздзеяння сонечных прамянёў людзі светлатварыя, светла- ці рыжавалосыя, з блакітнымі, зялёнымі ці шэрымі вачыма, з вялікай колькасцю вяснушак і пігментных плямаў.)

Другая распаўсюджаная прычына развіцця пухліны — **механічнае пашкоджанне** (траўма або частае naціранне) радзімкі.

Асцярожнымі павінны быць і будучыя мамы. Гарманальная перабудова ў іх арганізме — а яна абавязкова адбываецца падчас **цяжарнасці** — нярэдка цягне за сабой сур'ёзныя змены ў клетках скуры.

Акрамя таго, фактарамі рызыкі лічацца **генетычная схільнасць** (меланома ў аднаго з членаў сям'і) і **сонечныя апёкі,** перанесеныя ў дзяцінстве.

Як жа вызначыць «небяспечную» радзімку? Існуе так званая сістэма «АКОРД меланомы» — па першых літарах кожнай з прыкмет перараджэння. Гэтыя прыкметы варта ведаць кожнаму чалавеку, які клапоціцца аб сваім здароўі і здароўі сваіх блізкіх.

**Асіметрыя**. Уявіце сабе, што праводзіце праз радзімку вось. Асіметрычную радзімку не ўдасца «падзяліць» на дзве роўныя часткі.

**Край**. Сігналам небяспекі можа служыць адсутнасць выразнага, роўнага краю радзімкі. Пры злаякасным перараджэнні край радзімкі можа становіцца зубчастым, рваным.

**Афарбоўка (Окраска)**. Колер радзімак вар'іруе ад белага да цёмна-карычневага. Галоўнае — каб ён быў аднародным. Калі ў афарбоўцы з'яўляюцца рознакаляровыя ўкрапіны: напрыклад, на светлай радзімцы праступаюць чорныя кропкі або на цёмнай паверхні ўзнікаюць пражылкі чырвонага, шэрага, сіняга адценняў — хутчэй за ўсё, з радзімкай не ўсё ў парадку.

**Памер (Размер)**. Чым большы памер радзімкі, тым вышэйшая рызыка яе перараджэння. У чорныя спісы трапляюць пігментныя плямы, дыяметр якіх шырэй за 6 мм. Хоць і маленькі дыяметр (1—2 мм) зусім не выключае магчымасці развіцця пухліны. Узбройцеся лінейкай і вымерайце дыяметр радзімкі, якая вас непакоіць. Вымярэнні спатрэбяцца таксама для вызначэння наступнага параметра.

**Дынаміка**. Сігналам трывогі могуць быць любыя змены ў прывычнай для вас карціне: напрыклад, радзімка павялічылася ў памеры, стала таўсцейшай, цямнейшай або святлейшай, пачала крываточыць або на яе паверхні ўтварылася скурачка. Вас павінны насцярожыць таксама сверб, смыленне, з'яўленне трэшчын і лушчэнне, паколванне і напружанне ў вобласці радзімак. Асаблівую ўвагу надавайце радзімкам, якія размяшчаюцца на траўманебяспечных участках скуры: на валасістай частцы галавы, на падэшвах ног і інш.

Такім чынам, калі не хочаце прапусціць момант, калі ад небяспечнай пухліны можна пазбавіцца без рызыкі для здароўя і жыцця, аглядайце сябе і сваіх дзяцей не радзей як адзін-два разы на год (абавязкова ў пачатку і напрыканцы лета) і звяртайце ўвагу на тое, ці не змяніліся радзімкі і ці не з'явіліся новыя. Не саромейцеся выкарыстоўваць пры гэтым лупу і лінейку. А калі баіцеся штосьці не запомніць да наступнага агляду — запісвайце. Заўважылі нейкія змены — не адкладвайце візіт да ўрача, абследуйцеся для ўласнага заспакаення.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Сіла слова

# «НА ЎСЁ ДОБРАЕ І ЗДАРОВАЕ...»

***(Працяг. Пачатак у нумары за 5 снежня.)***

Сустракаліся і больш арыгінальныя замовы, з багатым наборам вобразна-выяўленчых сродкаў. «Кіла-піліца, красная дзявіца, тут табе не садзіцца, тут табе не ляпіцца. Садзіцца табе, ляпіцца табе, сярод цёмных лясоў, крутых берагоў, сыпучых пяскоў, гдзе людзі не ходзяць, пціцы не лятаюць. Там табе садзіцца, там табе ляпіцца, а з раба божага (імя) удаліцца. У імя Атца, Сына і Святога Духа. Амінь. Амінь. Амінь» («Ад грыжы», в. Ярмакі); «Суку, мой суку, прэкрасный мой суку. Як табе, суку, не адрастаць, так мёртвым людзям з магілы не ўставаць. Так у раба божага (імя) не бываць: не ўрочнай, не малошнай, не падзіўнай, не падзімай, не вадзяной, не касцяной, ні галоднай, ні ўнутранай, ні ўстрэчнай, ні папярэчнай. Амінь» («Ад грыжы», в. Пінкавічы); «Грызь-грызіна, твая матка — сіроцінка, у чыстым полі дзіця нарадзіла, тонкім лыкам адрэзала: грызь, не грызі жывот (імя), ідзі на мхі, на балоты, а ў (імя) не мучай жывот. Амінь» («Ад грыжы», в. Лемяшэвічы); «Ранняя зорачка, божая памашніца. Угавораю рабу божаму грыжу. Як гэтаму суку на карэнні не стаяць, так і ў жывату раба божага грыжы не бываць. Угавораю малочную, жаночую, мужчынскую. Па касцях не хадзіць, косці не ламаць. Грыжа, выходзь з нутра на сметніцу! Выходзь на талкавішча! З талкавішча — на могілкі. Там мая мамка памерла. Як мне з мамкай не гаварыць, так і табе, грыжа, у жываце не хадзіць і болі ніколі і ніякай не тварыць. Амінь» («Ад грыжы», в. Галева); «Гаварыць трэба дзевяць разоў раніцою на ўсходзе сонца: «Грыжа, грыжа, не грызі косці ўнутры роднага жывата і не прыходзь болей ніколі». Гаварыць гэтыя словы і адначасова пагрызці зубамі тое месца і папляваць дзевяць разоў на сучок (дрэва ці нешта драўлянае)» ( «Замова ад грыжы», в. Боркі); «Спачатку прашаптаць малітву «Отча наш». Потым узяць крэм і над ім прашаптаць тры разы, кожны раз сплёўваючы цераз левае плячо. Словы павінны быць наступныя: піла-піліца, красная дзявіца, тут табе не садзіцца, тут табе не ляпіцца. Садзіцца табе, ляпіцца табе сярод цёмных лясоў, крутых берагоў, сыпучых пяскоў, гдзе людзі не ходзяць, гдзе пціцы не лятаюць. Там табе ляпіцца, а з рабы божай (імя) грыжы ўдаліцца. У імя Айца і Сына і Святога Духа. Амінь» (грыжу мазаць крэмам безымянным пальцам на ноч, і да раніцы не ўставаць з ложка)» ( «Замова ад грыжы», в. Дабраслаўка); «Як таму дрэўцу ў суставах не бываць, і мясу на нём не нарастаць, так у младзенца (імя) грыжы не бываць, цела не ламаць, косці не ламаць. Я грыжу вымаўляю з жоўтых касцей, і з чорнае крыві, з віскоў, з валаскоў у младзенца (імя). Ты — мышка, я — кошка, я грыжу выгрызаю і вон выкідаю» («Замова ад грыжы», в. Сошна); «На чорным моры стаяў дуб зялёны, а ў тым дубе — дупло, а ў тым дупле — гняздо, а ў тым гняздзе — яйцо, а ў тым яйцэ — зай, што тую грызь выгрызай! Амінь» («Ад грыжы», в. Боркі).

**Аляксей НЕНАДАВЕЦ.**

Адусюль

## Тэлефон дыягнастуе абанента па кашлі

**АМЕРЫКАНСКІЯ і аўстралійскія вучоныя распрацоўваюць дадатак для мабільных тэлефонаў, які дазволіць вызначаць наяўнасць рэспіраторных захворванняў у абанента па яго кашлі.**

Мабільная дыягностыка будзе пабудавана на параўнальным аналізе кашлю карыстальніка з папярэдне запісанай фанатэкай, якая будзе ўтрымліваць гукі ўсіх рэспіраторных захворванняў людзей абаіх палоў, рознага ўзросту, вагі. Пакуль у распараджэнні распрацоўшчыкаў знаходзіцца база звестак з некалькіх дзясяткаў відаў кашлю, але ў агульнай складанасці трэба запісаць каля тысячы прыкладаў. Плануецца, што абаненту будзе дастаткова пакашляць у мабільны тэлефон, каб той вызначыў, ці хворы ён на прастуду, грып, пнеўманію або іншыя рэспіраторныя захворванні.

Вучоныя адзначаюць, што кашаль здольны расказаць многае пра захворванне, яго паходжанне і цячэнне. Напрыклад, адвольны кашаль здаровага чалавека звычайна крыху гучнейшы, чым міжвольны кашаль хворага. Акрамя таго, вядома, што да кашлю хворага чалавека прымешваюцца самыя разнастайныя гукі, хрыпы і тоны, якія дазваляюць спецыялістам паставіць дакладны дыягназ. Гэты дадатак да мабільнага тэлефона распрацоўваецца для краін у стадыі развіцця, дзе адной з асноўных прычын дзіцячай смяротнасці з'яўляецца пнеўманія.

## Біяпаліва шкодзіць наваколлю

**ВЫКАРЫСТАННЕ ў якасці паліва для аўтамабіляў біяэтанолу пацягне за сабой рост аб'ёмаў вуглякіслага газу, які выкідваецца ў атмасферу, а таксама выкліча павелічэнне плошчаў лесу, які высякаецца. Такія звесткі былі атрыманы ў ходзе даследаванняў, праведзеных амерыканскімі вучонымі Цімам Серчынгерам, Дэнам Каменам і Джэры Мялілам.**

Раней лічылася, што біяпаліва нейтральнае ў дачыненні да экалогіі, аднак вучоныя падлічылі ўвесь урон, які наносіцца атмасферы падчас збору раслін, з якіх выпрацоўваецца біяэтанол (цукровы трыснёг, кукуруза), іх перавозкі і перапрацоўкі, і высветлілі, што выкарыстанне біяэтанолу ў выніку можа прывесці да павелічэння выкідаў вуглякіслага газу.

З ростам патрэбнасці краінаў у біяпаліве ўзрасце і плошча палёў, якія выкарыстоўваюцца для пасеву кукурузы і трыснягу, што прывядзе да высечкі лесу. Лясныя масівы, якіх становіцца ўсё менш, у сваю чаргу, будуць перапрацоўваць у кісларод меншыя аб'ёмы вуглякіслага газу. У даследаванні адзначаецца, што для таго, каб да 2050 года ўдвая знізіць колькасць вуглякіслага газу, які выдзяляецца ў свеце, неабходна замяніць 59 працэнтаў усяго лесу ў свеце палямі з раслінамі для вытворчасці біяэтанолу, а гэта, у сваю чаргу, пацягне за сабой павелічэнне неперапрацаваных выкідаў $CO_2$ на дзевяць мільярдаў тон у год.

## Вынайшлі тэлефон для глухіх

**ВУЧОНЫЯ Карнэльскага ўніверсітэта ЗША прыдумалі мабільны тэлефон для глухіх і людзей, якія дрэнна чуюць, паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы.**

Праца тэлефона пабудавана на прынцыпах відэазванка (або відэаканферэнцыі). Праблема перадачы вялікай колькасці трафіку ў выніку такога кантактавання атрымала арыгінальнае вырашэнне. Сістэма тэлефона дакладна распазнае толькі жэсты рук і рухі вуснаў суразмоўцы.

Мінулым летам нейрабіёлагі з Швецыі распрацавалі пластык, які ў адказ на электрычныя імпульсы выдзяляе тыя ж рэчывы, што і нервовыя клеткі ў час перадачы сігналаў.

Вынаходства дазволіць вяртаць слых і ствараць больш удасканаленыя пратэзы. Ёсць таксама яшчэ адна надзея для глухіх — слухаць скурай.

## Герань — драпежная расліна



**ВУЧОНЫЯ выявілі мноства новых відаў насякомаедных раслін, якія належаць увогуле да 23 сямействаў. У лік драпежнікаў трапілі некаторыя віды гераніевых і ружавых. Артыкул даследчыкаў апублікаваны ў часопісе Botanical Journal of the Linnean Society.**

Насякомаедныя, або драпежныя, расліны здольныя атрымліваць пажыўныя рэчывы, ловячы і ператтраўляючы дробных насякомых. Упершыню яны былі апісаныя ў 1769 годзе натуралістам Джонам Элісам у лісце да вядомага сістэматыка Карла Лінея. Адзін з самых вядомых прадстаўнікоў насякомаедных раслін — гэта расянка, распаўсюджаная ў Расіі. Насякомаедныя рознымі спосабамі заманьваюць свае ахвяры на паверхню органаў, якія выдзяляюць страваўальныя ферменты.

Да гэтага часу батанікам было вядома каля 650 відаў драпежных раслін, прыналежных да 19 сямействаў. Аўтары новай работы вывучылі прадстаўнікоў сямействаў, якіх звычайна не адносяць да насякомаедных. Вучоныя рабілі выснову аб патэнцыйных драпежніцкіх схільнасцях раслін у тым выпадку, калі знаходзілі ў іх ферменты, неабходныя для ператтраўлівання насякомых. У лік скрытых «мясаедаў» трапілі прадстаўнікі сямейства гераніевых, ружавых і марцініевых.

Нядаўна даследчыкі зрабілі ў пэўным сэнсе супрацьлеглае адкрыццё. Арахнолагі выявілі ў Цэнтральнай Амерыцы павука-вегетарыянца. У адрозненне ад сваіх сабратаў ён цалкам перайшоў на харчаванне раслінная ежай.

## 40 працэнтаў — аптымальны варыянт

**ДЛЯ прыцягнення максімальнай увагі з боку мужчын жанчынам трэба агаляць 40 працэнтаў паверхні цела. Такія высновы змяшчаюцца ў даследаванні групы вучоных з брытанскага ўніверсітэта Лідса, апублікаваным у часопісе Behaviour.**



У аснову даследавання леглі назіранні, зробленыя ў буйным начным клубе. Чатыры жанчыны фіксавалі ў што апранутыя наведвальніцы клуба, а таксама колькі разоў за вечар да іх падыходзяць мужчыны. Для мэтаў даследавання адну аголеную нагу прыраўнялі прыкладна да 15 працэнтаў цела, кожную руку да 10, а тулава — да 50 працэнтаў цела.

Найбольшым поспехам карысталіся тыя жанчыны, якія адкрывалі менавіта 40 працэнтаў цела, у асаблівасці наведвальніцы клуба, вопратка якіх аблягала цела, а рухі былі правакацыйнымі. Да іх падыходзілі да 40 разоў за вечар. Даследчыкі адзначаюць, што жанчыны, якія агалялі больш за 40 працэнтаў цела, атрымлівалі менш увагі. Мабыць, мужчыны пазбягалі іх як патэнцыяльна няверных партнёрак.

**Падрыхтавала Ірына ПЯТРОВІЧ.**

